МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар ВДУ імя П.М. Машэрава
А.У. Ягораў
“___” ____________2019 г.

# ПРАГРАМА

## уступнага іспыту ў магістратуру

## па спецыяльнасці 1-21 80 15 Гісторыя

Віцебск 2019

СКЛАДАЛЬНІК:

Дулаў А.М. – загадчык кафедры гісторыі Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай гісторыі Беларусі
(пратакол № 7 ад 05.02.2019 г.)

Саветам гістарычнага факультэта
(пратакол № 2 ад 22.02.2019 г.)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па сваёй структуры патрабуе вызначэння галоўных паняццяў, ідэй, тэндэнцый, фактаў, дат, імён і іншых элементаў гістарычных ведаў. Яна патрабуе, каб студэнты маглі раскрыць сутнасныя элементы эканамічных адносін і важнейшыя рысы гаспадарчага развіцця; дэмаграфічнай характарыстыкі і сацыяльнай стратыфікацыі грамадства; асноўныя палітычныя падзеі і іх уплыў на дзяржаўную эвалюцыю; канфесійнае і культурнае развіццё.

Праграма ўступнага іспыту ў магістратуру прадугледжвае аналіз айчыннай гістарыяграфіі і асноўных крыніц па вывучаным праблемам і аспектам гістарычнага мінулага беларускага народа.

Праграма для паступаючых у магістратуру складаецца з сямі раздзелаў, якія ахопліваюць асноўныя этапы развіцця беларускіх зямель са старажытнасці па сучасны перыяд.

## Уводзіны.

Этапы гістарыяграфічнага вывучэння гісторыі Беларусі. Вядучыя ўстановы гістарычнага профіля ў Рэспубліцы Беларусь. Гістарычныя школы ў айчыннай гістарычнай навуцы. Асноўныя крыніцы па гісторыі Беларусі.

## Раздзел I.

**Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі.** Перыядызацыя першабытнага грамадства. Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі. Пачатак засялення продкамі чалавека тэрыторыі Беларусі. Першыя стаянкі. Умовы, лад жыцця, сацыяльная арганізацыя, асноўныя заняткі першабытных людзей. Зараджэнне вытворчых форм гаспадарання. Пачатак апрацоўкі жалеза. Пераход да класавага грамадства. Ваенная дэмакратыя. Даіндаеўрапейцы, балты. Рассяленне ўсходнеславянскіх плямёнаў. Праблема этнагенэзу беларусаў. Рэлігія і мастацтва першабытных людзей.

**Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.** Стан сельскай гаспадаркі, асноўныя прылады працы. Узнікненне гарадоў, іх колькасць і геаграфічнае размяшчэнне. Гарадское рамяство, унутраны і знешні гандаль. Формы феадальнай уласнасці на зямлю. Формы феадальнай залежнасці і эксплуатацыі залежнага насельніцтва. Погляды гісторыкаў на сацыяльна-эканамічныя адносіны ва ўсходніх славян у IX – XIII стст. Беларускія землі і Старажытная Русь.

Палітычная гісторыя Полацкага і Тураўскага княстваў у IX-XIII стст. Дзяржаўнасць у Панямонні, Пабужжы і Пасожжы. Знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у пачатку XIII ст. Барацьба Полацкага княства з крыжакамі. Вячка Кукенойскі, Усевалад Герцыгскі, Уладзімір Полацкі - арганізатары барацьбы. Бітвы з мангола-татарамі на тэрыторыі Беларусі.

Заснаванне Полацкай і Тураўскай епархій. Першыя асяродкі і дзеячы хрысціянізацыі Беларусі. Значэнне прыняцця хрысціянства. Пісьменнасць, арыгінальная літаратура. Пачатак летапісання. Архітэктура, жывапіс, прыкладное мастацтва. Праблема хрысціянізацыі тэрыторыі Беларусі ў гістарычнай літаратуры.

## Раздзел II.

**Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага і ўключэнне беларускіх зямель у яго склад.** Праблема ўтварэння ВКЛ. Пытанне аб месцазнаходжанні “летапіснай” Літвы. Прычыны аб’яднання балцкіх і славянскіх зямель у адзінай дзяржаве. Узвышэнне Наваградка. Міндоўг і яго палітыка. Войшалк. Трайдзень. Цэнтралізатарская палітыка Віценя, Гедыміна, Альгерда. Сталіца, герб, мова дзяржаўнага справаводства ВКЛ. Значэнне ВКЛ у гісторыі беларускага народа.

**Унутрыпалітычнае становішча і знешняя палітыка ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст.** Дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання. Дынастычная барацьба 70 – 90-х гадоў XIV ст. Крэўская ўнія. Востраўскае пагадненне. Княжанне Вітаўта, яго ўнутраная і знешняя палітыка. Разгром крыжакоў пад Грунвальдам. Прывілеі 1387 г. і 1413 г. Барацьба феадальных груповак за ўладу ў 30-х гг. XV ст. Казімір IV і яго палітыка. Праўленне Аляксандра і Жыгімонта I Старога. Памежныя войны канца XV – першай паловы XVI ст., іх прычыны і вынікі. Барацьба з набегамі крымскіх татар. Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гг. Адміністрацыйная, судовая і ваенная рэформы.

**Люблінская ўнія і яе вынікі. Палітычнае становішча беларускіх зямель у другой палове XVI – першай палове XVII ст.** ВКЛ у Лівонскай вайне. Прычыны Люблінскай уніі. Пазіцыі бакоў. Люблінскі сойм і яго рашэнні. Антылюблінскія настроі

ў 70 – 90-х гг. XVI ст. Становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. “Пакта канвента”. “Генрыхавы артыкулы”. Стэфан Баторый, яго унутраная і знешняя палітыка. Леў Сапега і яго дзейнасць. Статут 1588 г. і яго значэнне. Погляды гісторыкаў на дзяржаўны характар Рэчы Паспалітай. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расію падчас “Смутнага часу”. Ілжэдзітрый І. Ілжэдзмітрый ІІ. “Смаленская” вайна.

**Эканамічнае развіццё Беларусі ў XIV – першай палове XVII ст.** Даследаванне сацыяльна-эканамічных адносін эпохі феадалізму ў айчыннай гістарыяграфіі. Сельская гаспадарка ў Беларусі ў XIV – першай палове XVII ст. Асноўныя этапы юрыдычнага афармлення прыгоннага права. Формы феадальнага землеўладання і ўласнасці на зямлю. Землекарыстанне і павіннасці сялян, іх юрыдычны стан. Прывілеі 1387, 1413, 1432, 1434 і 1447 гг. і іх роля ў наступе феадалаў на асабістую волю сялян. Пачатак афармлення прыгоннага права. Судзебнік Казіміра IV 1468 г. Статут 1529 г. “Валочная памера” 1557 г. Арганізацыя фальваркаў. Прававое становішча сялян па Статутам 1566 г. і 1588 г. Катэгорыі і колькасць гарадоў і мястэчкаў. Сацыяльныя групы і этнічны склад гарадскога насельніцтва. Гарадскія рамёствы і промыслы. Цэхавыя арганізацыі. Унутраны і знешні гандаль. Магдэбургскае права і яго роля ў грамадска-палітычным жыцці гарадоў. Магістрат, яго структура і дзейнасць. Юрыдыкі. Гарадскія паўстанні канца XVI – першай паловы XVII ст.

**Фарміраванне беларускай народнасці. Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVII ст.** Перадумовы складвання народнасці. Энтагенетычныя фактары. Этнічная тэрыторыя. Асаблівасці мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры сярэдневяковых беларусаў. Этнічная самасвядомасць. Этнонімы. Менталітэт народа. Развіццё асветы. Літаратура. М. Гусоўскі. Заснаванне беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Ф. Скарына. Грамадска-палітычная думка. Архітэктура. Жывапіс і графіка. Асаблівасці ўплыву эпохі Адраджэння на Беларусь. Праблема паходжання “Белай Русі” у гістарычнай навуцы.

**Рэфармацыя і Контррэфармацыя на Беларусі.** Прадумовы і пачатак рэфармацыйнага руху ў Заходняй Еўропе, яго ажыццяўленне і вынікі. Прадумовы Рэфармацыі ў ВКЛ: этапы, накірункі, значэнне. Асаблівасці Контррэфармацыі ў ВКЛ. Дзейнасць Ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. Берасцейская царкоўная ўнія 1596 г. Распаўсюджванне ўніяцтва на тэрыторыі Беларусі. Значэнне царкоўнай уніі. Праблема ўніяцкай царквы ў гістарычнай літаратуры.

**Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў другой палове XVII - пачатку XVIII ст.** Эканамічны заняпад беларускіх зямель і яго прычыны. Становішча сялянскай і феадальнай гаспадаркі. Становішча гарадскога насельніцтва. Заняпад рамеснай і гандлёвай дзейнасці. Пачатак магнацка-шляхецкай анархіі. «Хатняя вайна» у ВКЛ. Абвастрэнне нацыянальна-рэлігійных супярэчнасцей.

**Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XVII ст.** Прычыны і характар вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654 – 1667 гг. Ход ваенных дзеянняў на Беларусі ў 1654–1655 гг. Адносіны насельніцтва Беларусі да падзей вайны. Палітыка цара Аляксея Міхайлавіча ў Беларусі ў гады вайны. Ход ваенных дзеянняў у 1656 – 1667 гг. Умовы Андрусаўскага перамір’я. Падзеі першай Паўночнай вайны 1655 – 1660 гг. на тэрыторыі Беларусі. Кейданская ўнія. Вынікі войнаў для Беларусі.

**Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў час другой Паўночнай вайны (1700 – 1721 гг.).** Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1701 – 1706 гадах. Раскол шляхты. Гродзенская аперацыя. Ход ваенных дзеянняў у Беларусі ў 1707 – 1708 гадах. Бітва ля в. Лясная. Адносіны насельніцтва Беларусі да ваюючых бакоў. Вынікі вайны для Беларусі.

**Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў сярэдзіне і другой палове XVIII ст.** Эканамічнае становішча беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. Стан сельскай гаспадаркі. Памешчыцкая гаспадарка і фальварачная вытворчасць. Рамесная вытворчасць. Мануфактуры. Унутраны і знешні

гандаль, развіццё шляхоў зносін. Знешнепалітычнае і ўнутрапалітычнае становішча Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай у сярэдзіне 60-х – пачатку 70-х гадоў.

**Падзелы Рэчы Паспалітай і ўключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.** Першы падзел Рэчы Паспалітай: прычыны і яго вынікі. Палітыка рэформаў. Канстытуцыя 3-га мая 1791 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Ход паўстання на тэрыторыі Беларусі. Палітыка царызму на далучаных беларускіх землях у апошняй трэці XVIII – пачатку XIX ст. Праблема ўваходжання беларускіх зямель у склад Расіі ў гістарычнай навуцы.

**Культура Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст**. Гістарычныя ўмовы развіцця культуры. Стан школьнай асветы і выхавання. Рэформы сістэмы адукацыі. Эдукацыйная камісія і яе дзейнасць. Ідэі Асветніцтва на Беларусі. Грамадска-палітычная думка. Вусная народная творчасць. Літаратура. Тэатральнае і выяўленчае мастацтва. Архітэктура.

**Раздзел III.**

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст.** Тэрыторыя і насельніцтва Беларусі ў першай палове XIX ст. Адміністрацыйныя рэформы. Сельская гаспадарка. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Рэформы П.Д. Кісялёва 30 – 50-х гадоў і іх значэнне. Развіццё прамысловасці і гандлю. Прадумовы фарміравання капіталістычнага спосабу вытворчасці.

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 года. Адносіны беларускага сялянства і шляхты да падзей Вайны 1812 года. Акупацыйная палітыка французкіх войскаў. Бярэзінская аперацыя. Вынікі вайны для Беларусі. Праблема характара Вайны 1812 г. у гістарычнай літаратуры канца XX – пачатку XXI ст.

**Грамадска-палітычны рух на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст.** Вывучэнне грамадска-палітычнага руху першай паловы XIX ст. у гістарыяграфіі гісторыі Беларусі. Асаблівасці сацыяльнага складу ўдзельнікаў грамадска-палітычнага руху на Беларусі. Тайныя таварыствы вучнёўскай моладзі. Уплыў дзекабрысцкага руху. Падзеі паўстання 1830 – 1831 гг. на Беларусі. Змена палітыкі царызму. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага руху ў 40 – 50 гадах XIX ст. Ф. Савіч. Зараджэнне беларускага нацыянальнага руху.

**Рэформы 60 – 70-х гг. XIX ст. і асаблівасці іх правядзення на тэрыторыі Беларусі**. “Вялікая” рэформа ў даследаваннях савецкай і айчыннай гістарыяграфіі. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў сярэдзіне XIX ст. Падрыхтоўка сялянскай рэформы. Правядзенне рэформы. Сялянскі рух у 1861–1862 гг. Змены ў рэалізацыі рэформы. Вынікі і значэнне аграрных рэформ. Земская, судовая, школьная, цэнзурная, гарадская, ваенная рэформы. Значэнне буржуазных рэформ. Контррэформы Аляксандра III. Русіфікацыя краю.

**Паўстанне 1863 г. у Беларусі. Кастусь Каліноўскі і яго дзейнасць**. Прычыны паўстання. К. Каліноўскі і яго рэвалюцыйная дзейнасць. “Мужыцкая праўда”. Пачатак паўстання. Арганізацыя паўстанцкіх атрадаў і іх дзейнасць. Падаўленне паўстання. М. Мураўёў. Характар і прычыны паражэння паўстання. Гісторыкі аб паўстанні 1863 г.

**Развіццё капіталізму ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы Беларусі ў другой палове XIX ст.** Асноўныя даследаванні праблемы развіцця капіталізму на тэрыторыі Беларусі ў айчыннай гістарыяграфіі. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Асаблівасці развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Сусветны аграрны крызіс і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі беларускіх губерняў. Сялянскія перасяленні на мяжы стагоддзяў. Этапы сялянскага руху ў 1864 – 1900 гг. Праблема кулакоў і фермераў. Спецыялізацыя беларускай прамысловасці, яе галіновая структура. Прамысловая рэвалюцыя. Рост гарадоў. Чыгуначнае будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў парэформенны перыяд.

**Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў другой палове XIX ст**. Гістарыяграфія грамадска-палітычнага руху ў савецкай і айчыннай навуцы. Ліберальна-

буржуазны рух. Народніцкі рух. Эвалюцыя рабочага руху. Распаўсюджанне марксізму. Рэвалюцыйна-дэмакратычны рух. Утварэнне і дзейнасць першых палітычных партый на тэрыторыі Беларусі.

**Беларуская культура ў другой палове XIX ст. Пачатак фарміравання беларускай нацыі.** Палітыка ўрада ў галіне культуры ў 60 – 90 гг. XIX ст. Стан асветы, развіццё мастацкай літаратуры. Друк. Быт і матэрыяльная культура. Навука. Тэатр і музыка. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Жывапіс. Графіка.

Гістарычныя ўмовы ўтварэння беларускай нацыі. Асаблівасці пачатковага этапа генеэзіса беларускай нацыі. Беларускі нацыянальны рух у другой палове XIX ст.

**Палітычнае становішча Беларусі ў пачатку XX ст.** Сіяніцкі рух на мяжы XIX – XX стст. "Паліцэйскі сацыялізм". Развіццё сацыял-дэмакратычнага руху. II з'езд РСДРП і яго гістарычнае значэнне. Утварэнне партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Утварэнне і дзейнасць БСГ.

**Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. у Беларусі.** Вывучэнне першай рускай рэвалюцыі беларускімі савецкімі гісторыкамі. Насяванне рэвалюцыйнай сітуацыі. Прычыны рэвалюцыі. Пачатак рэвалюцыі і яе этапы. Рэвалюцыйны рух ў студзені-верасні 1905 г. Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Маніфест Мікалая II ад 17 кастрычніка. "Курлаўскі растрэл". Снежаньская палітычная стачка. Адступленне рэвалюцыі. Дзейнасць дэпутатаў ад беларускіх губерняў у I-ай і II-ой Дзяржаўных думах. Прычыны паражэння рэвалюцыі і яе значэнне.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.** Стан прамысловасці. Эканамічны крызіс 1900–1903 гг. Дэпрэсія і прамысловы ўздым 1907 – 1913 гг. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Сталыпінская аграрная рэформа, яе сутнасць і вынікі. Праблема сталыпінскіх пераўтварэнняў у гістарычнай літаратуры.

**Палітычнае становішча беларускіх зямель у 1907 – 1913 гг.** Вывучэнне рабочага, сялянскага і салдацкага руху ў беларускай савецкай гістарыяграфіі. Грамадскі рух у перыяд рэакцыі. Трэцячэрвенская палітычная сістэма. Аслабленне рэвалюцыйных партый. Спецыфіка ліберальнага руху. Палітычныя пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый. Дынаміка, характар рабочага і сялянскага руху. Прычыны, мэты і ажыццяўленне земскай рэформы ў заходніх губернях.

**Беларусь у гады першай сусветнай вайны.** Пачатак вайны. Захоп немцамі Заходняй Беларусі. Ваенныя аперацыі на Заходнім фронце ў 1916 г. Бежанства. Ваенныя павіннасці насельніцтва. Заняпад сельскай гаспадаркі. Мілітарызацыя прамысловасці і транспарту. Спецыфіка рабочага руху ў прыфрантавых умовах. Сялянскі рух. Салдацкія выступленні.

**Культура Беларусі ў пачатку XX ст.** Уплыў рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. на развіццё нацыянальнай беларускай культуры. Асвета, школа, літаратура, друк. Тэатр, музыка, выяўленчае мастацтва, архітэктура. Навука.

**Падзеі Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Беларусі.** Прычыны і характар рэвалюцыі. Рэвалюцыйныя падзеі ў Петраградзе. Ліквідацыя самадзяржаўя. Двоеўладдзе. Растаноўка палітычных сіл на Беларусі. Першы з'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый.

**Беларусь паміж двума рэвалюцыямі 1917 г.** Палітычнае становішча. Органы ўлады. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый, прафсаюзаў. II з'езд беларускіх нацыянальных партый і арганізацый і яго наступствы. Крызісы Часовага ўрада і іх праяўленне на Беларусі. Рабочы і сялянскі рух. Чэрвеньскае наступленне і яго вынікі. Становішча на Заходнім фронце. Ліпеньскія падзеі. Канец двоеўладдзя. Карнілаўскі мяцеж. Асаблівасці эканамічнага і палітычнага крызіса восенню 1917 г.

## Раздел IV.

**Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне Савецкай улады ў Беларусі.** Вывучэнне падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўсталявання Савецкай улады ў беларускай савецкай гістарыяграфіі. Перамога ўзброенага паўстання ў Петраградзе. II

Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і яго рашэнні. Усталяванне Савецкай улады на тэрыторыі Беларусі і Заходняга фронта. Дзейнасць ВРК Паўночна-Заходняй вобласці і Заходняга фронту. Ліквідацыя “Камітэта выратавання рэвалюцыі”. Утварэнне Аблвыкамзаха. Першыя мерапрыемствы Савецкай улады ў палітычнай, эканамічнай і культурнай сферах. Антысавецкія змовы і мяцежы на тэрыторыі Беларусі ў канцы 1917 – пачатку 1918 г. Першы Усебеларускі з’езд (кангрэс). Адносіны да Кастрычніцкай рэвалюцыі палітычных партый і сацыяльных слаёў грамадства. Актывізацыя контррэвалюцыі. Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве. Першы Усебеларускі з’езд (кангрэс) і яго роспуск Савецкай уладай. Мяцеж корпуса Доўбар-Мусніцкага і яго ліквідацыя. Германская акупацыя. Абвяшчэнне БНР. Фарміраванне атрадаў Чырвонай гвардыі і частак Чырвонай Арміі. Брэсцкі мірны дагавор. Акупацыйны рэжым у Беларусі. Барацьба супраць акупантаў. Абвяшчэнне БНР. Ацэнка падзеі ў гістарычнай літаратуры.

**Утварэнне БССР і стварэнне Літоўска-Беларускай ССР.** Праблема ўтварэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР у гістарыяграфіі гісторыі Беларусі. Прадумовы ўтварэння БССР. Ідэйная барацьба вакол абвяшчэння БССР. Роля Белнацкама, беларускіх камуністычных секцый РКП (б) у стварэнні БССР. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР. I Усебеларускі з’езд Саветаў і яго рашэнні. Канстытуцыя БССР 1919 г. Утварэнне ЛітБелССР. Гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў Літоўска-Беларускай ССР у першай палове 1919 г. Праблема палітыкі “ваеннага камунізму” і яе ацэнка ў гістарычнай літаратуры.

**Савецка-польская вайна 1919 – 1920 гг.** Савецка-польская вайна: прычыны, ход ваенных дзеянняў. Стракапытаўскі мяцеж у Гомелі. Акупацыйны рэжым. Партызанская і падпольная барацьба. Палітыка і тактыка беларускіх палітычных партый і арганізацый (Цэнтральная беларуская рада Гродзеншчыны і Віленшчыны, БНК, Рада БНР, Беларуская вайсковая камісія, БКА, эсэры і інш.). Контрнаступленне Чырвонай Арміі на Заходнім фронце і яго вынікі. ВРК і яго дзейнасць. Контрудар польскіх войск. Падпісанне перамір’я. Паўторнае абвяшчэнне БССР. Рыжскі мірны дагавор. Беларускі паўстанцкі камітэт. Дзейнасць падпольных груповак на завяршальным этапе грамадзянскай вайны. Б. Савінкоў, С. Булак-Балаховіч - арганізатары антысавецкіх выступленняў на Беларусі. Слуцкае паўстанне, яго ацэнка ў гістарычнай літаратуры.

**Эканоміка БССР у перыяд НЭПа (1921 – 1927 гг.).** Гаспадарчая разруха. Палітычнае становішча. Вынікі палітыкі “ваеннага камунізму”. Пачатак аднаўленчых работ ва ўсіх галінах гаспадаркі. Сутнасць НЭПа, яго гістарычная абумоўленасць. Сельская гаспадарка, прамысловасць, гандаль: асаблівасці развіцця, поспехі і праблемы. Дапушчэнне прыватнага капіталу ў эканоміку рэспублікі. Становішча працоўных. Крызісы НЭПа і яго згортванне. Вынікі і ўрокі НЭПа. Погляды на НЭП у савецкай і айчыннай гістарыяграфіі.

**Удзел БССР ва ўтварэнні СССР.** Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР (1921 – 1927 гг.). Прадумовы аб’яднання савецкіх рэспублік у адзіны дзяржаўны саюз. IV з’езд Саветаў БССР і яго рашэнні. I з’езд Саветаў СССР. Узбуйненні тэрыторыі БССР. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа. Канстытуцыя СССР (1924 г.).

**Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ў БССР ў 1921 – 1927 гг.** Палітыка беларусізацыі: сутнасць, мэты і задачы. Ажыццяўленне беларусізацыі і яе спыненне. Дзейнасць Саветаў, прафсаюзаў, камсамола і інш. грамадскіх арганізацый. Усталяванне аднапартыйнай сістэмы. “Самаліквідацыя” палітычных партый. Канстытуцыя БССР 1927 г. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у канцы 20-х – пачатку 40-х гадоў. Гісторыкі аб таталітарным характары палітычнай сістэмы СССР. Прычыны фарміравання каманднa-адміністрацыйнай сістэмы ў СССР.

Унутрыпартыйныя дыскусіі і іх ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё рэспублікі. Зрыў беларусізацыі. Барацьба з “нацдэмамі” і яе вынікі. Дэфармiруючы ўплыў культа асобы І.В. Сталіна. Палітыка рэпрэсій на тэрыторыі БССР.

**Ажыццяўленне індустрыялізацыі і калектывізацыі ў БССР.** Беларускія савецкія гісторыкі аб індустрыялізацыі і калектывізацыі ў БССР. Неабходнасць глабальных пераўтварэнняў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Ідэйная барацьба вакол шляхоў дальнейшага развіцця краіны і яе адлюстраванне ў БССР. Асноўныя накірункі індустрыялізацыі і калектывізацыі. 1,2,3-я пяцігодкі, іх ажыццяўленне і вынікі. Змяненні ў сацыяльнай структуры рабочага класа і сялянства. Вынікі індустрыялізацыі і масавай калектывізацыі. Праблема мэтазгоднасці і метадаў правядзення масавай калектывізацыі ў БССР.

**Культурныя пераўтварэнні ў БССР у канцы 20-х – пачатку 40-х гадоў.** Развіццё адукацыі, навукі. Культурна-асветніцкая работа. Літаратура, музыка, тэатр, кіно, выяўленчае мастацтва, архітэктура. Уплыў культу асобы Сталіна і таталітарнага рэжыму на развіццё беларускай навукі і культуры. Вынікі і супярэчлівасць “культурнай рэвалюцыі”.

**Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921 – 1939 гг.). Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.** Гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі міжваеннага часу ў савецкай і айчыннай навуцы. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Становішча рабочага класа і сялянства. Палітыка польскіх урад. Умовы развіцця і дасягненні беларускай культуры. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух (прычыны, характар, палітычныя партыі і арганізацыі, іх дзейнасць). КПЗБ, КСМЗБ, ТБШ, БСРГ. Іх дзейнасць, лёс, гістарычнае значэнне.Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

## Раздзел V.

**Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР у 1939-1941 гг.** Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Арганізацыя Савецкай улады. Дзейнасць партыйных арганізацый. Народны сход Заходняй Беларусі і яго рашэнні. Уваходжанне Заходняй Беларусі у склад СССР і БССР. Пачатак сацыялістычных пераўтварэнняў у заходніх абласцях Беларусі і іх вынікі. Дэпартацыі. Праблема ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР.

**БССР у пачатку Вялікай Айчыннай вайны.** Растаноўка савецкіх і германскіх войск на заходнім участку фронта напярэдадні вайны. Прыгранічныя баі. Мабілізацыя працоўных на барацьбу з ворагам. Эвакуацыя. Абарона Мінска, Полацка, Гомеля, Оршы, Магілёва і інш. гарадоў. Прычыны паражэння савецкіх войск у пачатковы перыяд вайны.

**Акупацыйны рэжым гітлераўцаў на часова захопленай тэрыторыі Беларусі. Калабарацыйны рух на акупаванай тэрыторыі.** Нямецка-фашысцкая акупацыйная палітыка ў Беларусі: сутнасць, напрамкі, ажыццяўленне, вынікі. Генацыд. Угон на работы ў Германію. Адміністрацыйны падзел. Органы ўлады. Барацьба з партызанамі. Карныя аперацыі. Вытокі і сутнасць калабарацыянізму. Калабаранцкія арганізацыі. Другі “Усебеларускі кангрэс”.

**Падпольны і партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.** Гістарыяграфія падпольнага і партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.Дзейнасць падпольных арганізацый. Разгортванне партызанскага руху. Роля партыйных органаў і арганізацыя адпору ворагу. Роля ЦШПР і БШПР. Супраціўленне насельніцтва палітыцы акупантаў. Дзейнасць АК і АУН на тэрыторыі Беларусі. Гістарыяграфія пытання.

**Вызваленне Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў. Уклад беларускага народа ў разгром гітлераўскай Германіі і мілітарысцкай Японіі.** Пачатак вызвалення

Беларусі. Сумесныя дзеянні партызан з часцямі Чырвонай Арміі ў вызваленні ўсходніх раёнаў рэспублікі восенню 1943 г. "Рэйкавая вайна". Падрыхтоўка і правядзенне аперацыі "Баграціён". Ваенна-стратэгічнае і палітычнае значэнне разгрому гітлераўскіх войск у Беларусі. Пачатак аднаўленчых работ.

## Раздзел VI.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 40-х – першай палове 80-х гадоў.** Страты, панесеныя рэспублікай у вайне. Пераход да мірнага будаўніцтва. 4-я і 5-я пяцігодкі, іх выкананне. Працоўны гераізм беларускага народа. Дапамога саюзных рэспублік. Матэрыяльнае становішча працоўных. Развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі: праблемы і дасягненні. Эканамічныя рэформы 1956 і 1965 гг. Працоўная актыўнасць савецкіх людзей.

**Грамадска - палітычнае і сацыяльнае развіццё БССР у другой палове 40-х – першай палове 80-х гадоў.** Роля КПБ, Саветаў, прафсаюзаў, камсамола ў грамадска-палітычным жыцці. Выбары ў Вярхоўны і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Палітычная абстаноўка ў заходніх абласцях рэспублікі ў другой палове 40 – пачатку 50-х гг. Рэпрэсіі ў 40-х – пачатку 50-х гадоў. Ідэалагічная работа. Канстытуцыя БССР 1978 г. Нарастанне крызісных з'яў і іх уплыў на грамадска-палітычнае жыццё. Рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя: колькасныя і якасныя паказчыкі. Матэрыяльнае становішча насельніцтва. Ахова здароўя.

**Дзейнасць БССР на міжнароднай арэне ў пасляваенны перыяд.** Вывучэнне дзейнасці БССР на міжнароднай арэне ў пасляваенны перыяд беларускімі гісторыкамі. Супрацоўніцтва Беларусі з сацыялістычнымі, капіталістычнымі, развіваючымі краінамі ў сферах эканомікі, культуры, навукі. Грамадска-палітычныя сувязі. Удзел БССР у стварэнні ААН. Дзейнасць у ААН і інш. міжнародных арганізацыях. Праблема знешнепалітычнай самастойнасці БССР.

**Адукацыя, навука і культура БССР у пасляваенны перыяд.** Развіццё беларускай культуры сярэдзіны 40 – сярэдзіны 80-х гг. ХХ ст. у асвятленні беларускіх гісторыкаў. Дасягненні Беларусі ў развіцці навукі, адукацыі, культуры. Асноўная тэматыка мастацкіх твораў (літаратуры, жывапісу, кіно). Архітэктура, горадабудаўніцтва. Культмасавая работа. Праблемы развіцця беларускай культуры, адукацыі, навукі.

## Раздзел VII.

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі ў другой палове 80-х – 90-я гг. ХХ ст. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.** Сутнасць і гістарычная неабходнасць перабудовы, яе ажыццяўленне на Беларусі. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця. Фарміраванне шматпартыйнай сістэмы. Новыя з'явы ў эканоміцы. Нарастанне крызісу ў народнай гаспадарцы. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС і яе наступствы. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Крызіс палітыкі М.С. Гарбачова. Распад СССР. Абвяшчэнне незалежнай Рэспублікі Беларусь. Утварэнне СНД.

**Рэспубліка Беларусь у 90-я гг. ХХ – пачатку ХХІ ст. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь**. Складанасць эканамічнай сітуацыі ў 1991 – 1995 гг. Меры па выхаду з крызісу. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ і іх рэалізацыя. Беларуская эканамічная мадэль. Рэфармаванне аграпрамысловага сектара. Сацыяльнае становішча насельніцтва.

**Палітычнае развіццё Рэспублікі Беларусь.** Палітычная нестабільнасць у пачатку 90-х гг. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. Першыя выбары Прэзідэнта

Рэспублікі Беларусь. А.Р.Лукашэнка. Рэферэндумы 1995 і 1996 гг. Парламенцкая рэформа. Выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Усебеларускія народныя сходы і іх гістарычнае прызначэнне. Міжнароднае становішча Рэспублікі Беларусі.

**Праблемы і дасягненні развіцця беларускай культуры на мяжы тысячагоддзяў.** Нацыянальнае адраджэнне і яго ажыццяўленне ў Рэспубліцы Беларусь. Літаратура, тэатр, музычнае мастацтва. Культура нацыянальных меншасцей. Навука. Развіццё гістарычнай навукі ў Рэспубліцы Беларусь.

## Крытэрыі 10-бальнай шкалы ацэнкі ведаў і кампетэнтнасці студэнтаў.

